# ПАРТФОЛІА БУДУЧАГА НАСТАЎНІКА ЛІТАРАТУРЫ ЯК МЕТАД КАНТРОЛЮ ЯКАСЦІ ПРАФЕСІЙНАЙ АДУКАЦЫІ

**Пучынская Таццяна Міхайлаўна**
загадчык кафедры ўстановы адукацыі "Баранавіцкі дзяржаўны ўніверсітэт",
кандыдат педагагаічных навук, дацэнт
(г. Баранавічы, Беларусь)

Якасць прафесійнай адукацыі ў многім залежыць ад арганізацыі кантролю за вучэбнай дзейнасцю студэнтаў. Актуальнымі з'яўляюцца формы, метады і віды кантролю, звязаныя з магчымасцю не толькі ацэнкі ведаў, але і рэфлексіі вучэбнай дзейнасці будучых настаўнікаў. Адзін з такіх метадаў – партфоліа студэнта, якое «дазваляе адбіраць, фіксаваць і ацэньваць матэрыялізаваныя прадукты вучэбна-пазнавальнай, творчай, камунікатыўнай і іншых відаў дзейнасці тых, хто набывае веды…» [1, с. 314]. У педагагічнай навуцы партфоліа часам вызначаецца як «тэхналогія аўтэнтычнага ацэньвання адукацыйнай і прафесійнай дзейнасці» [2].

Адзінства меркаванняў даследчыкаў назіраецца ў характарыстыцы асаблівасцей партфоліа. Гэта ацэнка не толькі вучэбных дасягненняў студэнта, але і яго інтарэсаў, поглядаў на будучую прафесійную дзейнасць. Метад партфоліа можна ўключаць у прамежкавы, перыядычны (тэматычны) і выніковы кантроль. Формы яго рэалізацыі разнастайныя: «партфоліа дасягненняў, партфоліа водзываў; шатландскі дзённік; еўрапейскае моўнае партфоліа…» [1, с. 314]. Актуальнасць метаду партфоліа ўзрастае ва ўмовах рэйтынгавай сістэмы. Адзнака, атрыманая студэнтам за партфоліа, можа стаць адным з паказчыкаў яго вучэбных дасягненняў.

Укараненне партфоліа ў працэс вывучэння студэнтамі методыкі выкладання беларускай літаратуры – даволі працаёмкая, але педагагічна абгрунтаваная дзейнасць. Выкладчыку неабходна прадумаць раздзелы, якія будуць складаць змест партфоліа. У раздзел «Вучэбна-метадычная дзейнасць» змяшчаюцца працы, якія студэнт падрыхтаваў самастойна. Гэта канспекты, планы-канспекты, планы распрацаваных урокаў, у тым ліку праведзеных і апрабаваных на лабараторных і практычных занятках, у час праходжання практык; рабочыя сшыткі, запоўненыя ў час педагагічнай практыкі; паўрочныя прэзентацыі; аналіз вучэбна-метадычных комплексаў па беларускай літаратуры і іх асноўных элементаў – школьнай праграмы, падручнікаў; заданні, выкананыя ў межах кіруемай самастойнай працы.

Раздзел «Вучэбна-метадычная дзейнасць» уключае інфармацыю, атрыманую ад выкладчыка або з іншых знешніх крыніц (бібліятэка, электронная бібліятэка, сайты і інш.). Дадзеную частку партфоліа часам на-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зываюць «капілкай» або «калектарам». Матэрыялы, прапанаваныя «ў гатовым выглядзе», таксама неабходныя. Яны даюць магчымасць студэнту, асабліва ў пачатку вывучэння дысцыпліны, пазнаёміцца з прыкладамі арганізацыі педагагічнай дзейнасці па літаратуры. Калектар уключае гатовыя распрацоўкі ўрокаў, памяткі, інструкцыі, алгарытмы дзеянняў настаўніка літаратуры, пералік нарматыўных дакументаў. Матэрыял можна размеркаваць па рубрыках:

«Памяткі», напрыклад: «Вучымся чытаць выразна», «Як напісаць водзыў на літаратурны твор (кінафільм, спектакль)», «Як напісаць міні-сачыненне», «Вучымся складаць загадкі (казкі, байкі, скорагаворкі і інш.)».

«Алгарытмы» выяўляюць паслядоўнасць вучэбных сітуацый на ўроку, «крокі» навучання, напрыклад, «Структура ўрока па вывучэнні лірыкі», «Вывучэнне біяграфіі пісьменніка» і інш. Якасць навучання павышаецца, калі алгарытмы маюць канкрэтны характар: «Аналіз вобраза-персанажа ў эпічным творы (сярэднія класы)», «Ідэйна-тэматычны аналіз верша ў старшых класах», «Аналіз байкі», «Праца над эпізодам эпічнага твора». Неабходныя матэрыялы студэнт можа сабраць самастойна, выкарыстаўшы публікацыі ў часопісах «Беларуская мова і літаратура», «Роднае слова». Шмат змястоўнага і карыснага можна знайсці на сайтах Інтэрнэта. Галоўнае – інфармацыя павінна быць не толькі навукова значнай, але і адаптаванай студэнтам да ўласных педагагічных інтарэсаў.

«Узоры выканання пісьмовых работ па літаратуры» ўключаюць прыклады асобных відаў вучэбных работ (сачыненні розных відаў, водгук, літаратурная дыктоўка, віктарына, крыжаванка, тэст і інш.).

«Нарматыўныя дакументы, інструкцыі» складаюцца з адукацыйнага стандарту па прадмеце «Беларуская літаратура», тэматычнага планавання, вучэбнай праграмы, норм ацэнак вучэбнай дзейнасці школьнікаў па 10-бальнай сістэме, норм ацэнак выразнага чытання на памяць, тэхнікі чытання, «Інструкцыі аб парадку фарміравання вуснага і пісьмовага маўлення вучняў» і інш.

Наступны раздзел партфоліа – «Навуковая дзейнасць». Сюды неабходна змясціць пералік тэматыкі выкананых курсавых прац па методыцы выкладання літаратуры, па гісторыі беларускай літаратуры, сучаснай беларускай літаратурнай мове і інш. Грунтоўнасць раздзелу надасць тэматыка надрукаваных студэнцкіх артыкулаў, выступленняў на навуковых канферэнцыях, выкананых праектаў, заданняў у межах навуковых тэм. Можна прапанаваць студэнтам скласці кароткую анатацыю да праведзеных даследаванняў з апісаннем асноўных вынікаў.

Сабраныя ў партфоліа матэрыялы мэтазгодна пашырыць раздзелам «Пазавучэбная дзейнасць», куды варта ўключыць сцэнарыі правядзення

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

выхаваўчых мерапрыемстваў па літаратуры, планаванне працы гуртка або факультатыва.

Метадычна значны заключны раздзел – «Рэзюмэ», у якім студэнт павінен ацаніць сябе як будучага настаўніка літаратуры. Можна, напрыклад, скласці праект па вызначэнні індывідуальнай траекторыі развіцця «Мая асобасна-прафесійная перспектыва». Студэнт ацэньвае асабісты выбар прафесіі настаўніка літаратуры, кола жыццёвых інтарэсаў, індывідуальныя магчымасці ў адпаведнасці з сучаснымі патрабаваннямі да настаўніка літаратуры, асэнсоўвае шлях па дасягненні пастаўленай мэты, моцныя і слабыя бакі свайго прафесійнага росту. На занятках студэнты прадстаўляюць праекты, абараняюць іх.

Партфоліа змяшчае атрыманыя студэнтам дыпломы, граматы, сертыфікаты ўдзельніка канферэнцый, конкурсаў, алімпіяд; фотаздымкі праведзеных урокаў, выхаваўчых мерапрыемстваў, фотасправаздачу аб удзеле ў семінарах, майстар-класах і інш.

Пералічаныя патрабаванні да вядзення партфоліа паведамляюцца студэнтам загадзя. Крытэрыі ацэньвання распрацоўваюцца з улікам спецыфікі вучэбнай дысцыпліны і патрабаванняў адукацыйнага стандарту. Можна арыентавацца на такія паказчыкі, як паўната сабраных і распрацаваных матэрыялаў, іх разнастайнасць, матываванасць студэнта да набыцця будучай прафесіі, якасць выканання самастойных прац, пісьменнасць.

Назіранне за ўкараненнем партфоліа ў працэс прафесійнай падрыхтоўкі будучых настаўнікаў літаратуры сведчыць пра яго эфектыўнасць: акцэнт у навучанні пераносіцца з выкладчыка на студэнта, тым самым забяспечваецца індывідуальны падыход, прафесійная самаацэнка, сістэматызацыя атрыманых ведаў. Большасць студэнтаў даволі актыўна выкарыстоўвае партфоліа пры падрыхтоўцы да ўрокаў і пазакласных мерапрыемстваў па беларускай літаратуры ў час праходжання педагагічнай практыкі. Толькі некаторыя з іх не могуць гэтага зрабіць, што можна растлумачыць няўменнем на практыцы выкарыстоўваць сабраныя тэарэтычныя і практычныя матэрыялы. Сярод цяжкасцей вядзення партфоліа студэнты называюць «працаёмкасць», «значныя затраты часу».

Такім чынам, партфоліа фарміруе педагагічны стыль мыслення студэнтаў, уяўленне аб уласных прафесійных прыярытэтах, дазваляе падрыхтавацца да праходжання практыкі і працы ў якасці настаўніка беларускай літаратуры. Гэта своеасаблівая педагагічная аўтабіяграфія, «персанальны банк дадзеных», гісторыя прафесійнага росту студэнта.

**Літаратура**

1. Педагогика : учеб. пособие для бакалавров / под ред. П. И. Пидкасистого. – М. : Изд-во Юрайт, 2012. – С. 307–315.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

2. Бекузарова, Н. В. Профессиональное портфолио студента педагогического вуза в рамках итоговой аттестации / Н. В. Бекузарова // Сибирский педагогический журнал. – 2008. – № 6. – Режим доступа: ipps2.sfu-kras.ru/sites/ipps/institute.sfu-kras.ru/publications/1_4.pdf. – Дата доступа: 03.02.2016.

ий архив библиотеки МГУ имени А.А.